
DC UNIVERSE
1
RATED T TEEN
DCCOMICS.COM
SHAZAM!
SAVING THE WORLD...
...TRYING TO PASS MATH!
JOHNS
EAGLESHAM
SEN
ATIYEH
KICK ME
.BY
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
ШАЗАМ!
#1 (2019)
ПЕРАКЛАД:
АРТУР БАРАДАЧОЎ
АФАРМЛЕННЕ:
СЯРГЕЙ КОЗЫРАЎ


DC
SHAZAM! 1 JOHNS • EAGLESHAM • SEN • ATIYEH


"ШМАТ СТАГОДДЗЯЎ ТАМУ СКАЛУ ВЕЧНАСЦІ БЫЛО БАЧЫЦЬ АДУСЮЛЬ".
"ЕЙНЫЯ ДЗВЕРЫ БЫЛІ АДЧЫНЕНЫЯ ДЛЯ ЎСІХ, ХТО МЕЎ ПАТРЭБУ".
"ЗА ЕЙНЫМІ ВЯЛІКІМІ ЗАЛАМІ НАЗІРАЎ РАДА ВЕЧНАСЦІ... ГРУПА З СЯМІ ЧАРАЎНІКОЎ І ВЯДЗЬМАРАК, ЯКІЯ ПРЫСЯГНУЛІ АБАРАНЯЦЬ МАГІЮ".
"ПАКУЛЬ АДНОЙЧЫ ЦЁМНЫ АБАРОНЦА НЕ ВЫЗВАЛІЎ СЕМ СМЯРОТНЫХ ГРАХОЎ... І ЎСЯ РАДА, АКРАМЯ АДНАГО ЧАРАЎНІКА, БЫЛА БЯЗЛІТАСНА ЗАБІТА".
"АПОШНІ ЧАРАЎНІК ВЫРАШЫЎ ЗАПЯЧАТАЦЬ СКАЛУ ВЕЧНАСЦІ".
"І КАЛІ ЗНІКЛА СКАЛА... РАЗАМ З ЁЙ ЗНІКЛА І МАГІЯ".
"ДА ТАГО ЧАСУ, ПАКУЛЬ СВЕТУ ЗНОЎ НЕ СПАТРЭБІЎСЯ АБАРОНЦА".
ГЭЙ?
ЁСЦЬ ТУТ ХТО?
НЕ.
НЕ, ГЭТА НЕ СПРАЦУЕ.


"ЧАРАЎНІК УБАЧЫЎ ПЕРАД САБОЙ МАЛАЛЕТНЯГА ЗЛАЧЫНЦА, ХЛОПЦА З ПРЫТУЛКУ, АД ЯКОГА ЗАЎСЁДЫ АДМАЎЛЯЛІСЯ. ШМАТ ХТО Б ПАЛІЧЫЎ ЯГО ЗА ХУЛІГАНА".
"КАЛІ Б НЕ ПАГЛЯДЗЕЛІ ГЛЫБЕЙ".
"ЧАРАЎНІК ЗАЗІРНУЎ У ДУШУ ХЛОПЧЫКА І ЎБАЧЫЎ ДЗІЦЯ, ЯКОЕ СТРАЦІЛА СЯМ'Ю. ЯГОНЫЯ БАЦЬКІ ЗНІКЛІ, КАЛІ ЁН БЫЎ МАЛЫ, І З-ЗА ГЭТАГА ЁН ЗБУДАВАЎ СЦЕНЫ, КАБ АБАРАНІЦЬ СВАЁ СЭРЦА".
SHAZAM! And the SEVEN MAGIC LANDS!
WRITER GEOFF JOHNS • ARTIST DALE EAGLESHAM • COLORIST MIKE ATIYEH • LETTERER ROB LEIGH
COVER DALE EAGLESHAM & ALEX SINCLAIR • VARIANT COVER GARY FRANK & BRAD ANDERSON
ASSISTANT EDITOR ANDREA SHEA • EDITOR BRIAN CUNNINGHAM
CREATED BY C.C. BECK AND BILL PARKER
ШЧЫРЫ ДЗЯКУЙ ЗА ПАДТРЫМКУ COMICSBY.BY:
Сяргей Лісічонак
"ЧАРАЎНІК УБАЧЫЎ, ПРАЗ ШТО ПРАЙШОЎ БІЛІ, І ЗДЗІВІЎСЯ, ШТО БОЛЬШ НІХТО НЕ ЗАЎВАЖЫЎ ЯГОНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ. БІЛІ АБАРАНЯЎ НЯДУЖЫХ АД ЗАДЗІРАК, ДАПАМАГАЎ ТЫМ, КАМУ НЕАБХОДНА САБЕ НА ШКОДУ".
ГЭТАЯ ЗАДАЧА НЕ ДЛЯ ТАКОГА ЯК ТЫ.
"БІЛІ БЭТСАН ДАКАЗАЎ, ШТО ЁН ВАРТЫ".
"ТАМУ ПЕРАД СМЕРЦЮ ЧАРАЎНІК ПЕРАДАЎ УСЕ СВАЕ СІЛЫ БІЛІ І НАЗВАЎ ЯГО НОВЫМ АБАРОНЦАМ МАГІІ!".
"АЛЕ Ў БІЛІ НЕ ЗАСТАЛАСЯ НАСТАЎНІКА".
"ЁН БЫЎ ВЫМУШАНЫ ВЫВУЧАЦЬ СВАЕ СІЛЫ БЕЗ РАЗУМЕННЯ САПРАЎДНАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ СКАЛЫ ВЕЧНАСЦІ І СЯМІ ТРОНАЎ".
"АЛЕ Ў ЧАС ПАТРЭБЫ ЁН ДАВЕДАЎСЯ СВАЁ САМАЕ МАГУТНАЕ ЗАКЛІНАННЕ... І ПАДЗЯЛІЎСЯ СВАЁЙ МАГІЯЙ З ТЫМІ, КАГО КАХАЎ ЯК СЯМ'Ю".
"НА ШЧАСЦЕ, БІЛІ АДКРЫЎСЯ СВАЁЙ НОВАЙ СЯМ'Е. СВАІМ ЗВОДНЫМ БРАТАМ І СЁСТРАМ. ГЭТА ВЫРАТАВАЛА ЖЫЦЦЁ БІЛІ І ЎСЯМУ СВЕТУ".
"У СЯМ'І ЗНАХОДЗІЦЦА САПРАЎДНАЯ СІЛА ШАЗАМА..."
"І Ў ГЭТЫМ ЖА ЯГОНАЯ САПРАЎДНАЯ СЛАБАСЦЬ".


СУЧАСНЫЯ ДНІ
ФІЛАДЭЛЬФІЯ
МУЗЕЙ АМЕРЫКАНСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ
"ТЫМ, КАМУ НЕ ДАВЯЛОСЯ ГЭТА ЎБАЧЫЦЬ, ЗАСТАЕЦЦА ТОЛЬКІ ВАРАЖЫЦЬ, ЯК..."
SCHOOL BUS
"...ЛЮДЗІ, ЯКІЯ ПРЫЙШЛІ З РОЗНЫХ ЧАСТАК КАНТЫНЕНТА, ЯКІЯ ГРЭБАВАЛІ І ЗАЎЗЯТА ПАГАРДЖАЛІ АДЗІН АДНЫМ, АДРАЗУ Ж СТАНУЦЬ АДЗІНАЙ БРАЦІЯЙ ПАТРЫЁТАЎ".
ЯК БАЧЫЦЕ, **БЕЗ** КІРАЎНІЦТВА ГЕНЕРАЛА ВАШЫНГТОНА, АМЕРЫКА ТАК БЫ І ЗАСТАЛАСЯ РАЗДРОБЛЕНАЙ.
АМЕРЫКА! ВАШЫНГТОН! БЛА-БЛА-БЛА!
ТААAК НУДНА.
А МНЕ ЦІКАВА.
ШТО ЦІКАВАГА Ў **ГІСТОРЫІ**, БІЛІ?
ГЭТА НЯ ПРОСТА **ГІСТОРЫЯ**, А **АМЕРЫКАНСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ**. ДЫ Ў НАС ЗАЎТРА **ТЭСТ** ПА ГЭТАЙ ТЭМЕ.
АМЕРЫКА ПЕРАМАГЛА, Я ЗРАЗУМЕЎ! ПЕРАМАГЛА НЕМЦАЎ!
ФРЭДЗІ ФРЫМЭН?
ШТО Я **КАЗАЎ** ПРА РАЗМОВЫ ПАДЧАС ЭКСКУРСІІ?
НЕ РАБІЦЬ ГЭТАГА?
ЗАГАВАРЫШ **ЗНОЎ**, РАЗУМНІК, І **РЭШТУ** ДНЯ ПРАСЯДЗІШ У **АЎТОБУСЕ**.
ВОХ, А МОЖНА Я ЗАРАЗ ПАЙДУ?
НІКОМУ НЕ ВАРУШЫЦЦА!
АДДАЙЦЕ НАМ УСЕ ВАШЫЯ **СТАРАДАЎНІЯ СТРЭЛЬБЫ** І ЎСЁ, ШТО ЁСЦЬ У ВАШЫХ **КАШАЛЬКАХ І ТОРБАЧКАХ**, І НІХТО НЕ ПАПАКУТУЕ!
БОЖАЧКІ, ТАК, ТАК, **ТАК**!
НАРЭШЦЕ ШТОСЬЦІ **ФАЙНАЕ**! ТАК, БІЛІ?
БІЛІ?
SHAZAM!
А ГЭТА ЯШЧЭ ХТО ТАКІ?



ВАМ ЗАСТАЕЦЦА ТОЛЬКІ ЗДА-ГАДВАЦЦА!
ПАСЛЯ ТАГО, ЯК Я ВЫМАВІЎ СВАЁ **ІМЯ** НЯДАЎНА, У МЯНЕ БЫЛІ ПРАБЛЕМЫ.



ПАГНАЛІ!
ХЛОПЕЦ **КУЛЕНЕПРАБІВАЛЬНЫ!**
ААДА!
ДОБРА, КАПІТАН ІСКРЫНКА, ЗНІКНІ АДСЮЛЬ, ІНАКШ ЛЮДЗІ ПАЧНУЦЬ **ПАМІРАЦЬ!**



АААА!
РАБЯТЫ, У МЯНЕ ЎСЁ БЫЛО ПАД КАНТРОЛЕМ!
У МЯНЕ Ў ВАЧАХ **ДВАІЦЦА**?
КАЛІ ТЭХНІЧНА, ХУТЧЭЙ **ПЯЦЕРЫЦЦА**.
ЗНАЧЫЦЬ НАС **ПЯЦЁРА**, ТАК?
ШАСЦЁРА, УЛІЧВАЮЧЫ **КАПІТАНА ІСКРЫНКУ**!
ГЭТА ЯНЫ!
ХТО **ЯНЫ**?
СУПЕРГЕРОЙСКАЯ КАМАНДА ФІЛАДЭЛЬФІІ! **ЛІГА МАЛАНАК**!


Я НАЗЫВАЮ ГЭТЫ ПРЫЁМ **«ВАКОЛ СВЕТУ»**!
АДПУСЦІ НАС!
СКАЖЫ **КАЛІ ЛАСКА**!
КАЛІ ЛААААААА!
АМАЛЬ!
Я НЕ БУДУ ШМАТ БАЛБАТАЦЬ, ТАМУ ШТО ЯНЫ **ЗАЎСЁДЫ** КАЖУЦЬ, ШТО Я ШМАТ ЛАПОЧУ, АЛЕ, СПАДЗЯЮСЯ, ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ВЫ ТРАПІЦЕ ЗА КРАТЫ, У БУДУЧЫНІ НЯ БУДЗЕЦЕ РАБАВАЦЬ.
ВЫ **ПРАСТРЭЛІЛІ** ЭКРАН ГЭТАГА ТЭЛЕВІЗАРА, ЧАМУ ЁН **НЕ** РАДЫ!
KZ-ZAK
КАЖА, ШТО ЁН БЫЎ **НОВЕНЬКІ**!
ТЫ ЎЖО ДЗВУХ АДКЛЮЧЫЎ!
ДОБРА, АЛЕ Я Б І **САМ** УСЁ ЗДОЛЕЎ.
САМ?
І ШТО Ў ГЭТЫМ **ЗАБАЎНАГА**?


ДОБРА, ХОПІЦЬ НА СЁННЯ СЕЛФІ І АЎТОГРАФАЎ! УСЕ Ў АЎТОБУС, ХУТКА!
ДЗЯКУЙ, ШТО ЗЛАВІЛІ ГЭТЫХ АБІЗГАЛАЎ, ЯНЫ РАБАВАЛІ МУЗЕІ ПА ЎСІМ ГОРАДЗЕ.
І ХТО-НЕБУДЗЬ БАЧЫЎ БІЛІ І ФРЭДЗІ?
МНЕ ПАТРЭБНЫЯ ВАШЫЯ ІМЁНЫ, ТРОХІ ПАДРАБЯЗНАСЦЕЙ НАКОНТ ІНЦЫДЭНТУ, І МОЖАМ РАЗЫХОДЗІЦЦА.
Э-Э... ХТО Ў ВАС ГАЛОЎНЫ?
Я.
МНЕ ЗДАВАЛАСЯ, Я ГАЛОЎНЫ.
НУ, Я СТАРЭЙ ЗА ЦЯБЕ.
Я БЫЎ ПЕРШЫМ.
ЧАМУ Б НАМ НЕ ПРАГАЛАСАВАЦЬ?
Я ГАЛАСУЮ ЗА МЭРЫ!
ГЭЙ!
НАМ ВЕЛЬМІ НЕАБХОДНЫ КОДАВЫЯ ІМЁНЫ.
Я САМЫ ДУЖЫ. МАБЫЦЬ МНЕ СТАЦЬ ЛІДАРАМ?
Я ЭКСПЕРТ У CALL OF DUTY. ВЕДАЮ БАЯВЫЯ СТРАТЭГІІ.
КАЛІ ГЭТА Ў НАС З'ЯВІЛАСЯ ІЕРАРХІЯ?
Я НЯ БУДУ ГАЛАСАВАЦЬ!
ХТО ГЭТЫЯ РАБЯТЫ?
Я ГАЛОДНЫ. СКАЖАМ, ШТО СУПЕРМЭН УСІХ ВЫРАТАВАЎ.
СПРАВЯДЛІВА.


ХАТА СЯМ'І ВАСКЕЗ
ДЗЕЦІ! ВЯЧЭРА!
МЫ НАВАТ НЯ ВЕДАЕМ, НАВОШТА БІЛІ АТРЫМАЎ ГЭТЫЯ ЗДОЛЬНАСЦІ.
КАБ ЗРАБІЦЬ НАШАЕ ЖЫЦЦЁ ЯШЧЭ ФАЙНЕЙ, ВОСЬ НАВОШТА!
СЯМЕЙНАЯ ВЯЧЭРА!
ЖМЕНЬКА СІРОТАК-НЕБАРАКАЎ? КАРМА НАМ АБАВЯЗАНА!
А З ВЯЛІКАЙ СІЛАЙ ПРЫХОДЗІЦЬ ПААСОБНАЯ АДКАЗНАСЦЬ! ТАМУ Я ПРЫДУМАЎ НАМ КОДАВЫЯ ІМЁНЫ!
МНЕ ПРОСТА ТРЭБА СЯБЕ ЯК-НЕБУДЗЬ НАЗЫВАЦЬ. ЯК НАКОНТ КАПІТАН МАРВ...
ЛАЗАНЬЯ ГАТОВАЯ!
БОЖУХНА!
МЫ ДУРЭЕМ
АД ЛАЗАНЫ!
ВЫГЛЯДАЕ ЦУДОЎНА, ДАРАЖЭНЬКІ.
ГЭТА ЛЮБІМАЯ СТРАВА БІЛІ. МЯРКУЮ, НАМ ТРЭБА АДСВЯТКАВАЦЬ, ШТО ЁН УЖО ЦЭЛЫ ГОД З НАМІ!


У ГОНАР ГЭТАГА, СЯМЕЙНУЮ РАЗМОВУ МЫ ПАЧНЕМ З ЦЯБЕ, БІЛІ.
СЁННЯ АДБЫЛОСЯ ШТО-НЕБУДЗЬ ЦІКАВАЕ?
ЗЛАДЗЮЖКІ ЗАХАПІЛІ Ў ЗАЛОЖНІКІ КЛАС БІЛІ І ФРЭДЗІ!
ШТО?!
ВОХ, ТАК, НЕ МАГУ ПАВЕРЫЦЬ, ШТО МЫ ЗАБЫЛІСЯ ВАМ ПРА ГЭТА ПАВЕДАМІЦЬ. УПЭЎНЕНАЯ, ВЫ ЧУЛІ ПРА ГЭТА Ў НАВІНАХ, УСЁ ДОБРА.
ІХ ВЫРАТАВАЛА... НОВАЯ КАМАНДА СЕПЕРГЕРОЯЎ.
НОВАЯ КАМАНДА СУПЕРГЕРОЯЎ?
ГРАМАВЫ АТРАД.
ЯНЫ ФАЙНЫЯ.
ФАЙНЫЯ, АЛЕ ГЭТА ДАКЛАДНА НЯ НАЗВА ІХНЯЙ КАМАНДЫ.
А МАБЫЦЬ.
ЁСЦЬ ПАЦЯРПЕЎШЫЯ?
ТОЛЬКІ ЗЛАДЗЮЖКІ.
І ТО, ПА БОЛЬШАЙ ЧАСТЦЫ ІХНЯЕ ЭГА.
САМЫМ ФАЙНЫМ БЫЎ МУЖЫК У СРЭБРАНЫМ КАСЦЮМЕ, ЁН КІРАВАЎ УСЁЙ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЮ!
ЁН МОГ РАЗМАЎЛЯЦЬ З ТЭХНІКАЙ!
З ТЭХНІКАЙ? ХТО ГЭТЫЯ РАБЯТЫ?
ЗІХАТЛІВЫЯ СЯБРЫ!
СУПЕРЧАРАЎНІКІ!
ГРАМАВЫ АТРАД!
ЛІГА МАЛАНАК!
ЧАРАЎНІКІ ФІЛАДЭЛЬФІІ!
ВЯДЗЬМАРЫ!
ДАРМА Я ЗАПЫТАЎ!


НЕ ПРЫГАДВАЮ, КАБ МЫ ТАК ХУТКА ПРЫБІРАЛІ СА СТАЛА І МЫЛІ ЗА САБОЙ ТАЛЕРКІ.
КУДЫ ГЭТА ВЫ ТАК СПЯШАЕЦЕСЯ?
РАБІЦЬ ДАМАШНЮЮ РАБОТУ!
ГОД ТАМУ БІЛІ Б І НЕ ЗІРНУЎ НА ЎСІХ АСТАТНІХ.
А ЗАРАЗ ТОЛЬКІ ПАГЛЯДЗІ, РОЗА. ЗАВАДАТАР ЧАРАДЫ!
ЁН ДОБРЫ ХЛОПЕЦ, ВІКТАР. ЯК І ЎСЕ ЯНЫ.
ЧАГО МЫ ЧАКАЕМ, ПАГНАЛІ!
ЖАДАЮ ПЕРАКАНАЦЦА, ШТО ВІКТАР З РОЗАЙ НЯ ПРЫЙДУЦЬ СЮДЫ. МНЕ САМОМУ НЕ ПАДАБАЕЦЦА, ШТО НЕЛЬГА ІМ ПРА ЎСЁ ПАВЕДАМІЦЬ, АЛЕ...
ПРАВІЛА СУПЕРГЕРОЯЎ НУМАР АДЗІН! НЕ ЎБЛЫТВАЦЬ БАЦЬКОЎ!
У ДАДАТАК, ЯНЫ Б НІКОЛІ НАМ ГЭТАГА НЕ ДАЗВОЛІЛІ.
ЗГОДНЫ.
"У НАС ШМАТ ПРАЦЫ".


САМЫМ ЛЕПШЫМ ГЕРОЯМ ФІЛАДЭЛЬФІІ ЎСЁ ПАД СІЛУ!
НАШУЮ КАЛЕКЦЫЮ ТРАФЕЯЎ ЯШЧЭ ТРЭБА ДАПРАЦАВАЦЬ.
ТЭСТ ДАРЛЫ ПА МАТЭМАТЫЦЫ НЕ ЗУСІМ УЛІЧВАЕЦЦА, АЛЕ ГЭТА ЛЕПШ, ЧЫМ НІЧОГА.
ЧЫЯ ГЭТА ІДЭЯ?
ДАРЛЫ. ПАДАБАЕЦЦА?
ТАК. ЛІЧУ, МЫ ЗРАБІЛІ ВЫБАР.
З НАЗВАЙ?
З СЯМ'ЁЙ.
ТАК, ДАРЛА.
Я ВАС НІ НА КАГО НЕ ПРАМЯНЯЮ, РАБЯТЫ.
НАРОД!
ВАМ ТРЭБА ПАЙСЦІ СА МНОЙ І ПАБАЧЫЦЬ, ШТО Я ЗНАЙШОЎ.
ЗАРАЗ ЖА!


КУДЫ МЫ ІДЗЕМ, ЮДЖЫН?
Я СКЛАДВАЮ МАПУ **СКАЛЫ ВЕЧНАСЦІ ЎЖО НЯ ПЕРШЫ МЕСЯЦ**, СПРАБУЮЧЫ ЗРАЗУМЕЦЬ, **ШТО** ГЭТА ЗА МЕСЦА, І...
...ТУТ ЁСЦЬ ШМАТ ПАКОЯЎ, ЯКІЯ ДАВЕРХУ ЗАПОЎНЕНЫЯ **КНІГАМІ**, І ДЗІЎНЫХ КАЛІДОРАЎ, ЯКІЯ ВЯДУЦЬ У **НІКУДЫ**.
АЛЕ ТУТ... ЁСЦЬ НЕШТА **НЕЗВЫЧАЙНАЕ**.
ГЭТАГА ЗАЛА Я НЯ ПАМЯТУЮ.
ЯГО ТУТ І НЕ БЫЛО. У МІНУЛЫ РАЗ ТУТ БЫЛА **СЦЯНА**, АЛЕ... ЯНА ЧАМУСЬЦІ **ЗНІКЛА**.
АЦАНІЦЕ!


ГЭТА **СТАНЦЫЯ.**


СТАНЦЫЯ?
ТУТ ТАК
НАПІСАНА.
ПАДОБНАЯ...
НА СТАНЦЫЮ
МЕТРО.
ЯНА **ФАЙНАЯ!**
І ВЕЛЬМІ
СТАРАЯ.
NO
ADULT
SUPERVISION
REQUIRED
ПАГЛЯДЗІЦЕ!
The MAGICLANDS
ШТО ГЭТА,
БІЛІ?


"НЯ
ВЕДАЮ".
ЗДАЕЦЦА,
Я ПАСПЯШАЛАСЯ.
ЯНЫ ДРЭННА
СПАЛАСНУЛІ СВАЕ
ТАЛЕРКІ, З-ЗА ЧАГО
ПАЛАМАЛАСЯ
ПАСУДАМЫЙКА.
ЯНЫ ХОЦЬ
СПРАБАВАЛІ.
ХТОСЬЦІ СТУ-
КАЕ Ў ДЗВЕРЫ,
ВІКТАР!
ТЫ **ТАК ПРОСТА**
НЕ АДКАРАСКА-
ЕШСЯ!
ДЫК ШТО
ГЭТА, БІЛІ?
ТУТ НАПІСАНА...
**ЧАРАДЗЕЙНЫЯ
ЗЕМЛІ.**
РАБЯТЫ!
ПАГЛЯДЗІЦЕ!
ЗАРАЗ ЗРАЗУ-
МЕЛА, ЧАМУ ТУТ
ТАК ЦЁМНА!
OFF
НУ ЖА,
ПЭДРА,
ДАПАМАЖЫ
МНЕ!
ON
ПАЧАКАЙ!
МЫ НЯ ВЕДАЕМ,
ШТО ТАДЫ АД-
БУДЗЕЦЦА!
ДЫ
БУДЗЕ...
МАГІЯ!
МІСТЭР
І МІСІС
ВАСКЕЗ?



Далей: Сардэчна запрашаем у вясёлыя землі!

MARY


GEOFF JOHNS
Writer

MAYO "SEN" NAITO
Artist


ROB LEIGH
Letterer





МЭРЫ!!!
ТАБЕ БОЛЬШ НЯМА КУДЫ ІСЦІ!
НІХТО ЦЯБЕ НЯ БУДЗЕ КА-ХАЦЬ ТАК, ЯК МЫ!
МЫ ПРЫКУЕМ ЦЯБЕ ДА ЛОЖКА, МАЛЕНЬКІ ЖУДАСНЫ МОНСТР!




*АРМІЯ ВЫРАТАВАННЯ ДАПАМАЖЫЦЕ БЯЗДОМНЫМ
THE SALVATION ARMY
HELP THE HOMELESS
ПРЫВІТАННЕ, САНТА.
НУ ПРЫВІТАННЕ.
А ТЫ НЯ ВЕЛЬМІ МАЛЕНЬКАЯ, КАБ ГУЛЯЦЬ АДНОЙ?
МЯРКУЮ, ШТО НЕ.
ГЭТА ВЕЛЬМІ ШЧОДРА З ТВАЙГО БОКУ. ТВАЕ БАЦЬКІ НАПЭЎНА ВЕЛЬМІ ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ, КАЛІ ВЫХАВАЛІ ТАКУЮ ДОБРУЮ ДЗЯЎЧЫНКУ.
ШТО Б ТЫ ЖАДАЛА АТРЫМАЦЬ НА РАСТВО?
НЯ ВЕДАЮ...
НІЧОГА, ШТО МОЖА ЗМЯСЦІЦЦА Ў КАРДОНЦЫ.
ШЧАСЛІВАГА РАСТВА, САНТА!


ВОСЬ ГЭТАЯ БЕДНАЯ ДЗЯЎЧЫНКА.
НЕ ХВАЛЮЙСЯ, ДРУЖА.
МЫ ПРАСАЧЫМ, КАБ ЯНА ТРАПІЛА Ў ДОБРЫЯ РУКІ.
ECK'S TOY STORE
CLOSED
ГЭТА МІСТЭР І МІСІС ВАСКЕЗ.
НУ ЖА... ПАВІТАЙ ІХ, ДЗЕТАЧКА.
ФРЭДЗІ?
ГЭТА МЭРЫ.
*ЯК ЗРАБІЦЬ ФЕЕРВЕРК СВАІМІ РУКАМІ ДЛЯ ДАРОСЛЫХ - НАЗВА КНІГІ
HOW TO MAKE YOUR OWN FIREWORKS FOR ADULTS ONLY!
ФРЭДЗІ Ў НАС УЖО НЕКАЛЬКІ ТЫДНЯЎ.
ЧАМУ Б ТАБЕ НЕ ПАВЕДАМІЦЬ МЭРЫ ШТО-НЕБУДЗЬ ПРА СЯБЕ, ФРЭДЗІ?
МАЕ БАЦЬКІ ЗА КРАТАМІ.
МАІМ ТАМ ТАКСАМА САМАЕ МЕСЦА.


Pet Shop
ПРЫВІТАННЕ!
...ТЭЛЕФАНАВАЎ ДОКТАР СІВАНА. ЯМУ ТРЭБА БОЛЬШ ТРУСАЎ.
ШТО ЁН З ІМІ РОБІЦЬ?
ЯКАЯ РОЗНІЦА? НАМ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ ЗА АРЭНДУ.
МЫ НЕ РАЗМАЎЛЯЛІ АДЗІН З АДНЫМ **ТЫДНЯМІ**.
АЛЕ Я **НАЗІРАЎ** ЗА ТАБОЙ.
ТЫ ПРЫТРЫМЛІВАЕШСЯ ПРАВІЛАЎ. ЗАСЦІЛАЕШ ЛОЖАК. КАЖАШ «ДЗЯКУЙ» І «КАЛІ ЛАСКА» БЫЦЦАМ ЦЯБЕ **ЗАЕЛА**.
Я ЗРАЗУМЕЎ. ТЫ НЕ ЖАДАЕШ СХІБІЦЬ І ВЯРНУЦЦА Ў ПРЫТУЛАК.
АЛЕ ЎСЁ Ж... ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА ПРАВІЛАЎ ВЕЛЬМІ НУДНА.
ЖАДАЕШ ЗАБРАЦЬ ТРУСА?
МНЕ НЕАБХОДНА ТОЛЬКІ ПАДСТАВА, КАБ УКЛЮЧЫЦЬ ПАЖАРНУЮ ТРЫВОГУ.
FIRE ALARM
PULL DOWN
«ТАДЫ МЫ С ФРЭДЗІ СТАЛІ СЯМ'ЁЙ».
Happy Friends Pet Shop


І ЯНЫ З ХОП! ПЕРАТВАРЫЛІ ГЭТАЕ МЕСЦА Ў МОЙ **САПРАЎДНЫ ДОМ**.
МАЛЕНЬКІ МІЛЫ ТРУС...
КАХАЮ ЯГО.
МЭРЫ, ТАМ БІЛІ ТЭЛЕФАНУЕ!
Billy
ФРЭДЗІ, ЧАМУ ТЫ ТЭЛЕФАНУЕШ З ТЭЛЕФОНА БІЛІ?
МУЗЕЙ... ДОБРА... СУСТРЭНЕМСЯ ТАМ.
МОЖНА Я ТАКСАМА ПАЙДУ?
ЁН ЖАДАЕ, КАБ УСЕ ПРЫЙШЛІ, ДАРЛА, ТАМУ...
SHAZAM!


THE BEGINNING!
ПАЧАТАК